**ТВОРЫ ПЕРАМОЖЦАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ “ЛЮДЗІ І СЛОВЫ”**
**КІРУНАК “ЛІРЫЧНАЕ ЎРАЖАННЕ”**

**Немагай Ганна Васільеўна, настаўнік Сімаковіч Наталля Віктараўна,**
**ДУА “Сярэдняя школа № 2 г.п. Бялынічы” Магілёўскай вобласці**

**Трыпціх**
**(па матывах рамана У . С.Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”)**

***Трыялет вяртання***
Прыйшоў да вас, бо я ваш родны сын.
Не аддзяліць! Так склалася вякамі.
Памру далёка - усё адно я вечна з вамі!
Прыйшоў да вас, бо я ваш родны сын.
Няма нічога ў мяне, апроч магіл,
Няма нічога ў мяне, з’яднаны з вамі!
Прыйшоў да вас, бо я ваш родны сын.
Не аддзяліць! Так склалася вякамі.

***Трыялет прысягі***
Клянуся моцна-моцна вас любіць!
Мячом абараняць магілы вашы і зубамі.
Нават калі мая магіла будзе і не з вамі,
Клянуся моцна-моцна вас любіць!
Абараняць! Бо ўсё адно я буду з вамі.
Ад вас мяне не змогуць аддзяліць.
Клянуся моцна-моцна вас любіць!
Мячом абараняць магілы вашы і зубамі!

***Трыялет яднання***
Пакуль жывот людскі на нашае зямлі
Не знікне, не загіне пад сярпамі,
Клянуся, што я вечна буду з вамі!
Пакуль жывот людскі на нашае зямлі
Не скончыцца, не знікне КАЛАСАМІ,
Абараняць мячом вас буду і зубамі,
Пакуль жывот людскі на нашае зямлі
Не знікне, не загіне ПАД СЯРПАМІ.

***

**Галушка Кацярына Вячаславаўна, настаўнік Хамянок Галіна Іларыёнаўна,**
**ДУА “Клясціцкая дзіцячы сад – сярэдняя школа імя У. А. Хамчаноўскага**
**Расонскага раёна” Віцебскай вобласці**

**Пад крылом у белага бусла**
***По матывах нарыса***
***У.С. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”***

***Прадмова***
Абдымаю крыламі белымі
Хаты, дрэвы, палацы, раллю.
У цябе , Беларусь мая, верую,
Пра цябе сваю песню пяю.

Абляцеў закуткі непраходныя,
Непралазы пяром загубіў,
Клекатанне сваё першароднае
Я Радзіме сваёй прысвяціў.

Нерэальна праўдзівую казку
Планер – ветразь пад небам нясе,
Калі просіш яго і чакаеш,
Тайну продкаў падорыць табе.

**Вёска з вышыні палёту…**

Наша вёска невялічка,
Каля трыццаці двароў,
А на захадзе дагэтуль
Досыць многа хутароў.
Больш за тысячу сядзібаў
Небагата вёсак ёсць,
Соцен некалькі , не болей,
Па ўсёй Беларусі скрозь.
Знешні выгляд невясёлы.
Паэтычны каларыт
Надаюць прысады-дрэвы,
Векавых дубоў граніт,
Велізарных дзічак шаты,
Садзік ёмкі ля жытла,
Неба сіняе без краю,
Лес зялёны і рака.
Хату ставяць талакою,
Бервяно сасны бяруць.
Столь, падлогу з дошак гонкіх
Для цяпла ўсцяж кладуць.
Дах двухскатны саламяны
Ці з чароту, “шчапяны”,
А часцей сустрэнеш гонту,
Шыфер, а калі, можна нават і здзівіцца,
Дах вянчае чарапіца.
Хату прызба абкружала,
А цяпер фундамент скрозь.
Уваход з двара раней быў,
А цяпер і з вуліц ёсць.
Вокны-вочы, як заўсёды,
Пазіраюць навакол.
Шляк разбяны па ўзоры
Падыходзіць пад франтон.

***

А для прыкладу спачатку
Апішу вам хутарок,
Да якога дабірацца
Трэба доўга праз лясок.
Разарваны паміж градаў
Полем канюшыны ён,

А ў зарасцях альховых
Льецца  чысты перазвон
Невялічкай Лошы – стронгі,
Да якой амаль упрытык
Прытуліліся хаціны
З пабудовамі да іх.
Гаспадарскія сядзібы
Адна воддаль ад другой,
Спраўны пуні і адрыны,
У кожнай і калодзеж свой.
Крыху далей, у звіліне,
Адзінокі ганак ёсць,
Ён застаўся ад фальварку.
Векавыя дрэвы штось
Шэпчуць над крыжом дубовым
З папярочынай крывой.
Напамін аб Каліноўскім
Быў ўзведзены былой
Гаспадыняй безуцешнай,
Закаханай у вобраз той.

***

Край рэспублікі паўдзённы.
Тут рака пад назвай Смердзь,
Прыгажэй у жыцці не бачыў,
Уяўлення не мог мець.
Кіламетраў за дзясятак,
Як у Прыпяць упадаць,
Рэчка-дзіва рукавамі
Пасляшае абдымаць
Астравы ў садах кіпучых,
Хаты там разгледзіш ледзь,
Здагадацца, дзе ёсць людзі,
Дапаможа толькі Смердзь.
Па руках, вярбой абвітых,
Па тунэлях, у імгле,
Чоўны доўгай вераніцай
Праплываюць па вадзе.
Ізумруд яе сцюдзёны
Лашчыць сонца аксаміт -
Прад вачыма вырастае
Пабудоў сучасны від.

***

Зноў паўднёвая дарога,
Толькі новы паварот.
У глыбі лясоў дрымучых,
Дзе дубровам пяцьсот год,
І сягодня пражывае
Самабытнейшы народ.
У два рады стаяць хаціны,
Густа дрэвам абраслі,
Дзе пабелены знадворку,
Дзе пабелены ўнутры,

Вокны сінім абвядзёны,
Дах пакрыты трыснягом.
Стаіць вёска ў атачэнні
Старажытнейшых дубоў.
Жыхары ў народных строях,
Каб не страціць карані,
Праслаўляюць дрэвы-цуды,
Б'юць паклоны да зямлі.

***

Абдымаюць Свіцязь моцна
Старадаўнія дубы,
Кучаравыя прычоскі
Папраўляюць ля вады.
Тут без мыла мыцца можна,
Будзеш чыста маладзён:
Валасы рыпяць адразу
Не адзін, а колькі дзён.
Паласа хацін харошых
Недалёка ад вады.
"Патаемная" малельня
Захавана ў гушчары.
Ёй гадоў чатыры сотні:
Цудадзейная царква,
З непаўторнаю разьбою,
Тры сяленні зберагла.

***

Гарадскога тыпу вёска,
Прадпрыемстваў колькі ёсць,
І музейным экспанатам
Не абдзелен будзе госць.
Над запруджанай рачулкай,
У непралазным гушчары,
Васьмісотгадовы волат
З дуплом-хатай унутры.
У ім стол паставіць можна,
Змясціць дзесяць чалавек,
Той сняданак незвычайны
Вам запомніцца навек.
А наводдаль - у руінах
Старажытнейшы касцёл,
З італьянскага мармуру
Смутак могілак відзён.
Недалёка быў маёнтак,
А цяпер застаўся парк.
Ліпы, саджаныя кругам,
Між сабой зрасліся так,
Што адна каб не ўпала
Унутр драўлянага круга,
Не ступіла б у альтанку
Чалавечая нага.

**Пасляслоўе**

У кожнай вёскі беларускай
Каларыту не адняць
Асаблiва, усё праўдзiва
З – пад крыла бусла вiдаць.
Па адметнасцях няцяжка
Назвы вёсак адгадаць.
Будзьце ўважлiвы, i бусел
Зноў вас возьме палятаць.

***

**Лазарава Кацярына Паўлаўна, настаўнік Кавалёва Святлана Анатольеўна,**
**ДУА “Сярэдняя школа № 23” г. Магілёва”**

**«Мая ладдзя роспачы»**
***Па матывах аповесці Уладзіміра Караткевіча***
***“Ладдзя роспачы”***

Каса і доўгі чорны плашч. Пазналі?
Я Смерць. Я вызначаю час. Прыходжу
Да старца і дзіцяці, да мужчыны,
Дзяўчыны… Мне ўсё роўна, ці разумны,
Ці не хватае ясных зорак з неба,
Ці ў аксаміце, ці з сумой жабрацкай.
Падсекчы вас, людзей, няма праблемы.
Адзін з вас толькі цяжкасць мне даставіў.
Але расказваць буду па парадку.

Гервасій Выліваха з Рагачова
Паводзін, так я чула, найзаганных:
Задзіра і бабздыр несамавіты.
Усё жыццё — шынок, жанчыны, жарты…
Ну як тут пройдзеш міма? Завітала.
Такога свет пазбавіць — дзякуй скажуць.

Пачаставаў пітвом. Пайшоў без спрэчак.
Шыпшыны кветку ўзяў. “Нашто?” — спытала.
Адказ: “Мая зямля са мною будзе”.
Во прага да жыцця! Ну што тут зробіш?

Апошні крок. Ужо ладдзя чакае.
Сярод людзей у ёй — сюрпрыз герою.
Я для яго дзяўчыну падсадзіла,
Бярозку (Во імёны выбіраюць!).
Няхай жа аб жыцці ён пашкадуе,
Няхай адчай яго хутчэй ахопіць!

Сама ж я плыць на той ладдзі не стала.
Што там было, я ведаю па чутках.

Спакойна йшла ладдзя да апраметнай.
Сум, роспач, цішыня — як і належыць.

Адкуль было мне ведаць, што Гервасій
І тут прычыну знойдзе весяліцца?!
Усю ладдзю мне ўзбунтаваў нахабнік —
Свавольства, дзёрзкасць, жарты, нават песні.
Нат Перавозчыка разварушыла!
А ад яго я не чакала здрады.

Да берага прыйшла ладдзя — Гервасій
Лемураў распужаў шыпшыны кветкай.
І мне са здзекам: "Добры дзень у хату".
Сяджу я ў крэслах, за плячом Арахна —
Павук, што п'е з людзей жыццё і памяць, —
А ён шуткуе ў Смерці на парозе.

Хто падштурхнуў, не ведаю сама я,
Мяне прапанаваць яму: "Згуляеш
У шахматы, ігрок? А стаўкай будзе
Жыццё". А ён, такі дурны, згадзіўся.
Прайшла гадзіна, біўся ён нядрэнна.
Прайграў, канешна, што і зразумела:
Не кожнаму гуляць са Смерцю можна.
Мая ж упэўненасць не на карысць мне,
І я таму Гервасію-блюзнеру
Яшчэ адну гульню прапанавала.
А стаўка? Аж па дваццаць год дабаўлю
Усім, хто плыў ладдзёю з Вылівахам.
Згадзізўся зноў. І як тут не згадзіцца?
Аплот апошні слабаму — надзея.

Але ж увагу я сваю згу-бі-ла!!!
Тады, відаць, і зяўнула ладдзю я
(Куды тады мае глядзелі вочы?).
За ёй — другую! Гэты Вылівaха
Здаровы сэнс, напэўна, зневажае,
Наканаванае ірве так дзёрзка,
Што я апамятацца не паспела,
Як зняў каня майго і мат паставіў.

Што ж. Перамог. Ён першы і апошні.
Усім па дваццаць год я падарыла,
А ён — са мной! І раптам нечаканасць!
Дзяўчына тая кволая, худая —
За ім, п'янюгам, бабнікам, злачынцам…
Такіх дурніц зусім не разумею!
І я згадзілася, яе дваццатку
Гадоў на іх абодвух раздзяліла.
І вось тут зноў мяне здзівілі людзі
Усе, што з імі на ладдзі сядзелі.
Яны (Куды глядзеў іх бедны розум?)
Бярозцы гэтай кволай з Вылівахам
Па два гады жыцця падаравалі.
Крычу: "Пабойцеся Арахны, людзі!
Па два гады ад кожнага! Гервасій
І гэтая бязглуздая кватушка

Атрымліваюць пяцьдзясят гадоў
На кожнага!" Неспадзявана выйшла…

Я адпусціла ўсіх. Не мне хвіліны
Лічыць да будучай сустрэчы нашай.
А прагнасць да жыцця ў людзей такая
Мне думкі нараджае, што, магчыма,
Я выбрала работу памылкова
І ці не выбраць з часам мне другую.

А трохі звялую шыпшыны кветку,
Што ўвесь той час мяне так нервавала,
Нагадваючы аб жыцці яскравым,
Яны на хмыз шыпшыны пасадзілі —
Цямнейшымі ўсе кветкі сталі разам.
Я за Бярозкай і за Вылівахам
Пазней прыйду. А над Дняпром пакуль што
Цвіце ўсё лета цёмная шыпшына,
Як знак жыцця, непадуладны Смерці.

***

**Мішкевіч Аліна Віктараўна, настаўнік Каржанеўская Алена Пятроўна,**
**ДУА "Сеўрукоўская базавая школа" Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці**

## Па матывах твора У.С. Караткевіча "Паром на бурнай рацэ"

«Белыя жонды», урады, паўстанні,
Смерці, уланы, вялікія страты.
Сепаратысты, кардон, катаванні,
Цар даў наказ – і няма вінаватых.

Цвёрда народ за свабоду змагаецца –
Мужныя людзі, Айчыны сыны.
Арышты , бойкі часта здараюцца,
Лютуе ўлада, ганьбяць паны.

Караю Божаю – голад раптоўны,
Неўраджай, перакрыты дарогі.
Блізка салдаты, патоплены чоўны.
Як жа пражыць? Няма дапамогі…

А да казармаў нясуцца пасланцы:
"Бойня была – у палоне важак".
"Мы разумеем, – кажуць паўстанцы. –
Не атрымаць перамогу ніяк".

Разліўся Дняпро, бляск у хмарах ад грозаў,
Кроплі, вятры, неба крэсляць маланкі.
Адчыніліся дзверы, пахнула марозам.
Бачаць салдаты жанчыну на ганку.

Стан яе зграбны праглядваўся ўночы,
Твар заварожваў – нямнога такіх.
Быццам азеры, чорныя вочы,
Боль патаемны чытаецца ў іх.

“Мне на той бераг,”– пачуліся словы.
Адказаў капітан (Леановічам зваць):
“Няможна нам, пані, наказ прыйшоў новы,
Людзей на той бераг нельга пускаць”.

Просіць жанчына: “Я з важным загадам:
Памілаванне мужу вязу”.
“Паненка, не трэба спрачацца з камрадам.
Цяжка на рэчцы. Нельга, кажу!”

Вочы жанчыны поўняцца горам,
Яна амаль плача, ён зноў не пускае.
Чуюцца крокі, з’яўляецца Гораў,
Выходзіць на ганак, рашэнне прымае.

Жанчыне гаворыць прыязна, аддана:
“Лічу я, што зможам адолець паводку.
Не страшна парушыць загад капітана.
Пойдзем, гатова для Вас ужо лодка.”

Чытаюцца ў твары жанчыны падзеі,
Яна ўжо сустрэчаю хуткаю мроіць.
Жыве яна толькі сваёю надзеяй…
І вось ужо Гораў назад лодку гоніць.

І смела глядзіць ён ў твар капітана.
А той раўнадушна: “Які неразумны…
Даўно ўжо няма ў жывых атамана,
Граф не дапусціць учынкаў бяздумных.

Памілаванне – проста адпіска.
Жонка імчыцца праз сцюжу, марозы.
А ў след ёй паслалі ўлана з запіскай:
“Спыніць, затрымаць! Нават пагрозай!”
На бераг другі – іншы наказ:
“Паўстанца – забіць, не марнуючы час.”

Цямнее ў вачах, у вушах моцны звон,
І думае Гораў: “Не, так не бывае”.
Падняў галаву, ў твар глядзіць ён.
І чуе нягоднік: “Я вас вызываю”.

Хмызы пад дубамі, росны мурог…
А Гораў не бачыць прыгожага ранне.
Бар`ер, пісталета націснуў курок…
Брэцер і падлец атрымаў пакаранне.

***

**Налівайка Аліна Андрэеўна, настаўнік Кожух Міхаіл Станіслававіч,**
**ДУА “Гімназія № 1 г. Жодзіна” Мінскай вобласці**

## “Чазенія”. Імпрэсія

Калі рамантыкі менее
Ці сум як “Квадрат” Малевіча,
У рукі бяру “Чазенію”,
“Чазенію” Караткевіча.
І светласцю думкі поўняцца,
Як цемра знікае раніцай.
Я веру Гражыне поўнасцю.
Я веру душы Будрайціса.
Надзея мая — чазенія,
Як і шыпшыны кветкі.
Жыццё нараджае геніяў,
Ды толькі, на жаль,
рэдка…

***

**Няхай Крысціна Уладзіміраўна, настаўнік Тарэндзь Анастасія Іванаўна,**
**ДУА “Лугаваслабадская сярэдняя школа” Мінскага раёна**

Белыя здані плывуць над зямлёю,
Рог паляўнічы астужвае кроў…
Вось мільгануць яны стужкай сівою,
Не пакідаючы чорных слядоў…
Сярод балотных ялін заімшэлых
І верасоў, што ўначы шапацяць,
Замак стаіць, ад стагоддзяў счарнелы,
Думкі-прывіды ў ім стогнуць, кіпяць.
Богам забыты той край-небарака,
Свет не трапляе на гэту зямлю.
Страх тут жыве, месца нібы праклята
І таямніцу нясе не адну.
У замку жыве  гаспадыня – Надзея,
Ціха згасае ў сэрцы святло.
А ў душы яе холад, завея -
Страхам калючым куты замяло.
Нібы галінка, што ветрам зламана,
Быццам прывід ўсё стаіць прада мной.
Богам за што яна так пакарана?..
У полі расце адно дрэўца зімой.
Хочацца крылы свае ёй расправіць,
Толькі ляжыць продкаў груз векавы.
Стан адзіноцтва  злачынцаў так бавіць,
Дзеўчыну, мусіць, звядуць да пары.
Хто скажа слова,той вузел развяжа,
Маску з прывідаў хто можа сарваць?
Хто свет пралье, хто ўсю праўду раскажа,
Хто не баіцца пра гэта празнаць?
Пан Беларэцкі не верыць у прывіды,
Верыць, што людзі ўсё зло прыняслі.

Вочы Надзеі, што страхам наліты,
Споўніцца шчасцем нарэшце змаглі.
Вецер шуміць над палескім балотам,
Вые над багнай, над змрокам начным.
Плача бугай, як пад нечым прыгнетам,
Быццам забыў аб спакоі зямным…

***

**Астапенка Аксана Мікалаеўна, настаўнік Касцянкова Святлана Аляксандраўна,**
**ДУА "Муравільскі ВПК яслі-сад – сярэдняя школа Касцюковіцкага раёна"**
**Магілёўскай вобласці**

**Пасвячэнне "Ладдзі роспачы"**

*- Раніцай я клікну варту. Чаго б ты хацеў у гэтую апошнюю ноч?*
*- Любові.*
*- Гэта немагчыма, -амаль варожа і жорстка сказала яна.*
*- Тады – зрабіць табе апошнюю паслугу. Паказаць гэты свет… Толькі не трэба іншых.*
У. Караткевіч "Ладдзя роспачы"

Калі ты прыйдзеш да мяжы,
Што дзеліць час на свет і цемру,
Адчуеш, як нальецца цела
Адным жаданнем-клічам – "Жыць!"
Ці помніш водар першых яблык?
Суніц рубінавых агні,
І шэпт тых дзіўных вуснаў прагных,
Што золатам рабілі дні?
Ці помніш асалоду сэнсу,
Што напаўняў жыццё красой?
І як тады казала сэрца:
"- Смерць не кране цябе касой!"
Валос ці памятаеш колер,
У якіх блукае маладзік?
Чаму ж так сэрца грае болем
На вёслах роспачы ладдзі?
Раней ты не спяваў элегій,
Не сумаваў. Ты проста жыў.
Твой шлях? Таб прайсці ад негі
Жыцця да нежывых мяжы…
Але ж застанецца каханне –
Шыпшыны дзікай агняцвет.
Не, не шкадуй аб смерці ранняй.
Ты жыў. Нам не забыць цябе

***

**Глазкова Віялета Андрэеўна, настаўнік Язэпчык Лілія Уладзіміраўна,**
**ДУА "Сярэдняя школа г.п. Мір" Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці**

**У падзеях мінулага наша карэнне**

У падзеях мінулага наша карэнне,
А дрэва без кораня не існуе.
Сякера пры дрэве… якое здарэнне!
Вякамі расло, а праз міг — ужо не.

Ля берага грушу сабе ўяўляю:
Галіны ўсыпаны цветам ружовым.
Не будзе ёй зводу, не будзе ёй краю,
Перавяжы ты хоць рэмнем гужовым.

Дняпро падбіраўся зусім як разбойнік.
Патрохі гвалтоўна ён бераг скрышыў.
Навошта рачулцы патрэбен палоннік?
Чаму вадой дрэва з бакоў акружыў?

А груша кіпела ў звоне пчаліным,
Губляла пялёсткі свае незнарок,
Цягнула да сонца старыя галіны,
Цвіла, дацвітала апошні гадок…

Спрадвеку шматзначнае «Выйсце крыніц» —
Пачатак гісторыі, лёсу Радзімы.
У час рэвалюцый, войн, навальніц
Не засохлі яны, засталіся жывымі.

Крыніцы выходзілі з нетраў зямлі,
Міналі людскія пакуты і гора.
Пасля, як слухмянае лона ракі,
Цяклі і нарэшце ўпадалі ў мора.

Якое чароўнае слова каханне!
Яму прысвячалі шмат казак, легенд.
У творы прайшлі цераз выпрабаванні
Не проста дзяўчына і інтэлігент!

Героі адважныя, добрыя сэрцам,
А кожны з іх шчыры душой чалавек.
І нават на зло самай жудаснай смерці
Яно застаецца — каханне навек.

Старонкі рамана — немераны вопыт.
Вось перада мной, чытачом, паўстае
Жыццё селяніна, духоўны свет, побыт,
Што ўсіх без астатку за сэрца кране.

Сябе адчуваючы ў цэнтры падзей,
Мне хочацца дзейнічаць разам з усімі,
Заўсёды падтрымліваць веру людзей,
Каб шчасная доля лунала над імі.

Не марна да сэрца людскога адпушчаны
Цудоўнага аўтара думак палёт.
Старонкі рамана — сівая мінуўшчына.
Шануй, захапляйся, калі патрыёт!

***

**Курило Дарья Дмитриевна, учитель Климуть Елена Евгеньена,**
**ГУО “Гимназия № 3 г. Гродно”**

In the off-road, for those who wandered,
My heart is burning out at the night…
You gave me a moment of happiness,
I gave you for that - instead.

When you, feeling painful thanks,
Lit the Universe,
I said: “Well, never perhaps
We will meet on the Earth again”.

And now – let people judge us –
And do not be envious:
You will never forget me, never,
You will never see me, never.

At sorrowful night, in the darkness of grave,
You will have only one wish – thirst
And you will never forget me, never again,
You will never be with me, never!

***

**Тарасенко Александра Валерьевна, учитель Костенецкая Ирина Викторовна,**
**ГУО “Средняя школа № 45 г. Могилёва”**

**“Я это время в памяти храню…”**

За тихим шелестом каштановым,
В осколках нерастраченной любви,
За краем черной, обгоревшей радуги
Осталось наше детство позади…

Мы к солнцу шли, мы жить хотели бешено,
Когда в неистовый, суровый час
Шальные пули полетели шершнями,
Другими в одночасье сделав нас.

Сжимало детские виски разрывами,
Покрылось небо синее войной.
И от потерь, от горя незабывного
Мы заболели яростной тоской.

Я помню улицы, друзей и Нонку…
Прогулки наши, разговор ночной.
Любил я эту юную девчонку
И был готов пожертвовать собой.

Нам нужно было становится взрослыми,
Иного выбора и не было у нас!
Не задавались мы любви вопросами
В тот непростой для всей планеты час.

И хоть война оставила отметки,
С улыбкой вспоминаю молодость свою.
Любовь моя ведь не прошла бесследно,
Я это время в памяти храню…

***

**Тепун Ольга Николаевна, учитель Вакульчик Инна Степановна,**
**ГУО "Гимназия № 3 им. В. З. Коржа г. Пинска" Брестской области**

## Монолог Андрея Белорецкого

"Могилы оставьте мертвым. Дыши с живыми", -
Так мне кричал закутанный в простынь вереск.
Так мне сироты пели и милостыню просили,
Так мне шептал подола вдовьего шелест.
А я наблюдал: Светиловича выносили,
И с каждым днём становилось
не-вы-но-си-мей.

Рыгор кормил подопечную, как синицу:
Потчевал прямо с рук ещё тёплым хлебом.
Шла осень. На юг отлетали птицы,
В Болотных Ялинах всё так же бродили легенды,
Надежда уже не надеется. Ей не спится;
В этот час я за правдой иду к каплице.

День вчерашний казался на шее
крестиком-амулетом,
А стал распятьем, к землице гнущим нещадно.
В твои сны заходит призрак, зовущийся Маленьким,
но Человеком.

Мысли плавятся изнутри, как раскаленная магма …
В забытьи я лечу в жадно раскрытое жерло
И раздвигаю пропасть руками, пытаясь
найти
разгадку.

Призраки прошлого оживают в ночных кошмарах.
Над Полесьем слышится плач – журавлиный клёкот.
Белая шкура украсит шляхетский замок:
Новый век украшает одну из пушистых ёлок.

Всё закончилось. Негаданно и нежданно.
Только в ушах остается Дикой Охоты топот.

***

**Бойко Владислав Александрович, учитель Зеленко Галина Ивановна,**
**ГУО «Засовьевский УПК детский сад – средняя школа Логойского района»**
**Минской области**

## Лебединый скит

Дитя рождается от матери,
А умирает за народ.
Святая истина в пословице скрывается!
Ордынский хан считал наоборот.
– Я хан Бату! Несу я смерть и много бед.
Кто мне противился – тому ломал хребет, –
Хан хвастался и сам себе дивился.
Его поэт Юсуфи смело возмутился:
– Послушай, хан, меня и внемли:
Лет через сто проклятия народ
Пошлёт за все захваченные земли.
Испачканный в крови, кому ты будешь мил?
Что скажешь ты, когда в твой мёртвый рот
Посыплется песок из завоёванных могил?
Хан хохотал в ответ:
– Народ?! Ведь это стадо,
Живущее законами инстинкта.
А наши пленники? Они уже рабы!
И дети их, рождённые рабами,
Умрут, не зная Родины, не зная языка!
Хан повторил приказ: дотла всё разорять!
Остались от врагов руины городов,
Да плыли по земле стенанья вдов.
И не могла уже земля дарить своих плодов.
За тёмным лесом, вставшим словно щит,
Сверкнуло озеро с зелёными лугами.
Из старых брёвен смётан ветхий скит,
Бредёт пустынник босыми ногами.
Бату увидеть старца пожелал.
Пришельца молча выслушал старик.
Взгляд палача сильным гневом пылал.
Отшельник не дрогнул, к ногам не приник.
Юсуфи на помощь пришёл старику
И мудрость напомнил он хану:
– Коль вспыхнешь – сгоришь, превратившись в муку,
Родившись – умрёшь, в Лету канув.
А что ты оставишь потомкам, Бату?
Что ты подаришь в наследство народу
Кроме гор черепов? – Твоих глаз слепоту,
Пепелища, пожары, проклятия роду?
Хан, повернувшись к поэту, сказал:
– Старик – не волшебник и не чародей.
Он, думаешь, нужен народу?

Здесь жизнью не жертвуют ради людей,
Чтоб подарить им свободу!
Поэт замолчал, а старец ответил хану:
– Если отпустишь всех этих людей,
То я для них жертвою стану.
Хан согласился свободу дать всем,
Кто в скит к старику вместится.
Не мог и подумать хан между тем,
Что может с людьми случиться?
– Коль ты обещал – так слово держи, –
Напомнил Юсуфи Бату.
– Честью и совестью, хан, дорожи!
Последние пленники скрылись в скиту.
Пленники все в лебедей превратились
И в ручеёк, что из скита бежал.
Птицы над озером долго кружились.
Старик со слезами их провожал,
Стоял на коленях и тихо молился:
– Боже! Дай камнем закончить свой век!
Ударив мечом, палач удивился:
– Старик – не простой, а святой человек!
Юсуфи воскликнул:
– Бату! Не ты удостоен сей чести!
Усвой, властелин, здесь урок простой:
Кто за народ свой умер – тот святой!
Не смог хан эту правду обесчестить.
Старик на глазах в валун превратился.
Из-под него тихо струйки текли.
И поняли все: камень слёзно молился,
Чтоб птицы к гнездовьям вернуться могли.
Хан бешенно хлещет коня кнутом,
Отсюда с полками прочь скачут.
– Как я боюсь этой страшной земли,
Где молятся камни, где камни плачут!
Над камнем кружили долгие дни,
Трубили, садились на воду
Лебеди. Благодарили они
Старика за жизнь, за свою свободу.
Может, от пуха тех лебедей
Белыми стали одежды людей,
И Русь была названа Белой.

***

**Гаврилова Валентина Александровна, учитель Середа Ирина Александровна,**
**УО «»Юридический колледж БГУ»**

## Дикая охота

Когда последний солнца луч
Погаснет, озарив болото,
Когда луна взойдет средь туч,
Король выходит на охоту.
Кровавой местью одержим,

Он отправляется в погоню,
И двадцать всадников за ним
Летят на молчаливых конях.
В их ножнах не звенят мечи,
Не мнется вереск под копытом,
Несутся бешено в ночи
Король с его немою свитой.
Пока на свете есть беда,
Охота скачет по трясине,
И одинокая звезда
Горит над нею в небе синем.

***

**Кузюрэнка Яўгенія Іваноаўна, настаўнік Дзмітрачэнка Наталля Сяргееўна, ДУА "Сялецкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Мсціслаўскага раёна" Магілёўскай вобласці**

**Па старонках "Дзікакага палявання…"**

Караткевіча том адкрываю на першай старонцы.
Адчыняецца мне ў мінулае наша ваконца.
Вось нямоглы стары разгарнуў пачытаць радасловец…
І зусім ён яшчэ не стары – малады ж яшчэ хлопец.
Гэта ў кнізе. А я быццам сплю.
І пад коўдраю цёплай мне сніцца,
Як даездчык Варона па пушчы да Стаха імчыцца.
І я сплю. І я сплю. Але ж бачу на ўласныя вочы,
Як Гацэвіч насустрач Ліколу таемнаю сцежкаю крочыць.
Пушча, дожджык імжыць… Бачу я: вось Андрэй Беларэцкі
Праз яловыя краты , праз прорву балот,
Цераз пусткі к Балотным Ялінам ірвецца.
Па гасцінцы імчацца да балю шляхецтва вазкі,
Дубатоўк і Надзея Яноўская Ветрык свой скачуць,
А дрыкганты ляцяць праз дрыгву і палі наўпраcткі,
І Малы Чалавек у маёнтку Раманавым плача.
Чую я: Галабурда трызніць і старая вахмістрыня енчыць,
І няшчасная Кульшына нешта бязглуздае менціць.
Страшна мне, мне баліць, бачу, бачу я цёмнаю ноччу,
Як загнаны у пастку Раман Жысь-Яноўскі глядзіць нам у вочы.
А васпан Дубатоўк пакаранне акрузе гатуе,
Беларэцкі ж з Рыгорам усіх ад навалы ратуюць.
Разагнаць у палацы мінуўшчыны цёмныя здані,
Разгадаць таямніцу нямога таго палявання,
І спыніць час адплаты нібыта няўмольнага Стаха,
І пазбавіць сялян і Яліны спрадвечнага жаху
Дапаможа Андрэю любоў да народа паданняў
Ды к Блакітнай Жанчыне Надзеі Яноўскай каханне.
Ён «шукаў свой народ», вывучаўшы сівыя легенды,
А здарылася так, што і іншае шчасце ён зведаў.
Ратаваў просты люд ён ад здзекаў і страшнай нагоды,
Чалавечае ж шчасце за гэта было для яго ўзнагародай.
І шалёны табун болей з багны на пусткі не рвецца,
І пачвар не баіцца сяланскае простае сэрца.

І Надзею сваю пад руку вядзе пан Беларэцкі,
А яна ўпершыню ад кахання і шчасця смяецца.
Паляванне закончана. Кропка. Закрыт радасловец.
І слухаўкі палаца больш стогнам страшэнным не мовяць.
Таямніц не хароняць страрыя яго сутарэнні,
Цішыня і пакой праз вякі зноў вяртаюцца не на імгненне.
І партрэты Яноўскіх нікому ўжо болей не сняцца,
А Андрэй і Надзея ў сталіцу шчасліва імчацца.
Караткевіча том на апошняй гартаю старонцы
І забыць не магу, не хачу а ні воднага слоўца.
Тут народ, тут мой край, тут гісторыі моцныя крылы.
І за гэта кажу ад душы табе шчырае дзякуй, Уладзімір!
Хай жыве з дня у дзень, з года ў год наш народ, любы край, наша мова,
Даражэй за якія няма нам на свеце нічога!
Хай любоў да зямлі, да народу заўсёды нам зоркаю свеціць,
Даражэй бо за гэта няма нам нічога на свеце!
І жыве тваё слова ў народзе, ў краіне, у мове тваёй найдаўжэй,
Бо нічога за іх не было для цябе даражэй!

***

**Силин Артём Сергеевич, учитель Силина Евгения Михайловна,**
**ГУО “Цельская средняя школа” Осиповичского райна Могилевской области**

**В.Короткевич**
**Был. Есть. Буду… (перевод)**

Был. Есть. Буду.
Потому, что всегда, как проклятый,
Живу бездонной тревогой,
Потому, что сердце моё распято
За все миллиарды двуногих.

За всех, поднимающих пашню в разорах,
За всех, кто в горячем пекле металла,
За всех, кто сражается с небом и морем,
За всех живых и кого не стало.

За всех, кто кровью пишет,
В борьбе
Из рабства подлой дорогой,
Кто край свой Родной, за все Народы
Восстанет даже на Бога.

За тех, кто гибнет за свой народ,
Кто спасает страну от краха,
За всех, кто бесстрашно смотрит вперёд
С баррикады,
Из пущи
И с плахи.

Кто со смертью спорит с ока на око,
С её улыбкой приветной.
И всё же возводит – очень далёкий –

Храм наш общий и светлый.

А когда он гордо засветит в зените –
Нерушимый – восстанет из ада,
Вы из распятого сердца каплю возьмите.
Последнюю.
Больше не надо.

И пусть она рядом с крылечком, сбоку где-то,
Догорает, детей не страшит
На граните любви,
На граните рассвета,
На граните памяти вашей.

***

**Харашун Ірына Мікалаеўна, настаўнік Якімава Таццяна Уладзіміраўна,**
**ДУА "Сярэдняя школа № 2 г. Давыд-Гарадка" Столінскага раёна Брэсцкай вобласці**

***Паэма па аповесці У.С.Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха"***

**Ізноў у сівой даўніне…**

У пошуках старых легенд,
Мясцовых баек і паданняў
Блукае фальклярыст Андрэй
І мае многа спадзяванняў.

І лёс прывёў яго сюды –
У родавы палац Яноўскіх,
Але не ведаў ён тады,
Што край жахлівы, не такоўскі…

Тут застарэлы, цёмны жах
Ужо настоены гадамі.
Становіцца ўжо звыклым пах
Палацу, змрочнага вякамі.

Але – што гэта? Цуда-дзіў!
Андрэй убачыў тут Надзею.
Яе ён шчыра палюбіў,
Яшчэ не ведаў пра падзеі…

Каханне тут – чароўны шлях,
Бо пражыць герою трэба
Блуканне па старых лясах –
Такая існуе легенда…

І Чалавек Малы, і Стах,
І Свеціловіч, і Варона…
На ўсіх яны наводзяць жах,
Усё становіцца чароўным…

Вось бачым прывіды каней,
На іх сядзяць прывіды-людзі.
Што іх чакае тут далей?!
Што з імі ўсімі раптам будзе?!

На паляванне выйшаў Стах!
Ён прагне помсты і забойства!
Над вёскамі пануе страх,
Страх голаду і вераломства.

Але цярпець не змог далей
Народ, хоць бедны, але мужны.
Тут кіраваць стаў усім Андрэй,
Каб помсціць смела, упарта й дружна!

Разгром быў поўны…На зямлі
Ляжала войска "палявання"…
І мужыкі перамаглі!
Што значыць сіла ўз'яднання!

Легендам часта верым мы,
Бо наш народ заўжды быў цёмны,
Бо пад прыгнётам, між бяды
Ўзрастаў характар непакорны.

Але нарэшце Дубатоўк
Знайшоў спакой навек у прорве.
Надзея выйшла на парог –
Канец хваробе, страху, болю…

Абуджаная ада сну,
Дзяўчына пад крылом Андрэя
Пакінула той страшны кут,
Жыве ў душы яе надзея!

І доўга, шчасліва жылі…
Каханне песняй салаўінай,
Як сонца, ззяла на зямлі,
Было ім зоркай той, адзінай…

Часамі, ужо праз шмат гадоў,
Андрэю ў сне віднелісь коні,
І Стах-кароль… І мужыкоў
Ён сніў уночы, у бяздонні…

Час "палявання " не прайшоў.
Пра гэта помніць будзем вечна.
І пра падзеі тых гадоў
Хай не забудзе чалавецтва!